ШКІРОНАК ІРЫНА СЦЯПАНАЎНА,
вядучы бібліятэкар
Фундаментальнай бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

# ТРЭНДЫ РАЗВІЦЦЯ СТУДЭНЦКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ТВОРЧАСЦІ ВА ЎМОВАХ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ, ЦІ ЯК ВЫРАСЦІЦЬ “КЛУМБУ” НА БІБЛІЯТЭЧНАЙ ГЛЕБЕ?

Апошнім часам нярэдка можна пачуць новамоднае слова “ТРЭНД”. Ці гэта тэлеперадача пра моду і стыль, ці зводка навін пра навуковыя дасягненні, змест гэтай з’явы не мяняецца. Трэнд вызначаюць як найбольш значны і заметны рух у развіцці чаго-небудзь.

Само стварэнне Клуба аматараў мастацкага слова “КЛУмБа” ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на базе Фундаментальнай бібліятэкі БДУ – з’ява чыстай вады знакавая, якая садзейнічае развіццю літаратурнай творчасці студэнтаў і далучэнню іх да гістарычнай спадчыны Беларусі і сусветнай культуры.

За два гады свайго існавання клуб стаў пляцоўкай для сустрэч універсітэцкай моладзі з вядомымі пісьменнікамі і творчымі людзьмі. Тут адбываецца мноства тэматычных мерапрыемстваў: літаратурныя гасцёўні і вечары, круглыя сталы і майстар-класы. Акрамя таго, клуб – гэта добрая альтэрнатыва “сцэны” для аўтараў-пачаткоўцаў. Сябрам клуба можа стаць любы студэнт, магістрант і аспірант.

Мы лічым, што сёння наша “КЛУмБа” дастаткова ўкаранілася, набрала сілу, расквітнела, і спадзяёмся, што ніякае пустазелле яе не заглушыць і вільгаці хопіць, і цяпла. Як нам удалося сабраць здольных творчых студэнтаў самых розных факультэтаў, якія раскіданы па ўсім горадзе, у адно аб’яднанне? Зацікавіць іх? Утрымаць? Не ведаю.

Але думаю, што некаторыя тэндэнцыі, якія паспрыялі развіццю клуба, мы ўсё ж сёння ўжо можам вызначыць.

Акрамя друкаваных абвестак аб стварэнні клуба, падачы інфармацыі на сайт бібліятэкі і ўніверсітэта, мы выйшлі ў Інтэрнэт-прастору, дакладней, у сацыяльныя сеткі, а яшчэ дакладней, стварылі “КЛУмБу” “Вконтакте”.

Такім чынам, 29 чэрвеня 2014 г. “Вконтакте” з’явіўся першы запіс: “Дарагія сябры! Запрашаем вас стаць удзельнікамі літаратурнай суполкі ”Клумба”, якая ствараецца на базе Фундаментальнай бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дасылайце вашы літаратурныя спробы пяра на нашу старонку. Спадзяёмся, што наша онлайн-знаёмства ў хуткім часе перарасце ў першае афіцыйнае пасяджэнне. Дату першай сустрэчы паведамім пазней. Літаратурных вам поспехаў!”

На ўчарашні дзень у групе 159 удзельнікаў, 614 запісаў, 29 фота-альбомаў. Група жывая, актыўная. Усе абвесткі, навіны “КЛУмБы”, віншаванні з народзінамі, перамогамі, артыкулы ў прэсе, лепшыя вершы – “Вконтакте”. Узнікае такое параўнанне: сама “Клумба” – лямпачка, а група “КЛУмБа” “Вконтакте” – яе ўключальнік.

30 верасня 2014 г. мы сабраліся ўпершыню. Галоўнымі ўдзельнікамі сталі пераможцы ўніверсітэцкага конкурсу “Славянскі калейдаскоп”, які другі год ладзіла бібліятэка, гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі і расійскае пасольства ў Доме Масквы. У гэтым навучальным годзе будзем адзначаць 5-гадовы юбілей конкурсу, які прымеркаваны да дня аб’яднання саюзных дзяржаў Расіі і Беларусі. Пераможцы конкурсу, як правіла, падчас падрыхтоўкі знаёмяцца з клумбаўцамі і пасля прыходзяць на чарговае пасяджэнне. Адно шкада, што падвядзенне вынікаў конкурсу адбываецца ў красавіку, затым сесія і лета. А пасля лета ўжо не ўсе з новенькіх вяртаюцца ў клуб, але тыя, хто не забыўся і за лета, становяцца сапраўднымі актывістамі.

Галоўны госць першага збору клумбаўцаў – старшыня гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў, вядомы пісьменнік Міхаіл Паўлавіч Пазнякоў, які быў старшынёй конкурснага журы. Ён прынёс саюзны часопіс “Белая вежа”, дзе былі надрукаваныя першыя літаратурныя пробы нашых студэнтаў-пераможцаў. Гэта было свята – кожны атрымаў у падарунак ад Міхаіла Паўлавіча свой экзэмпляр.

Нам не было яшчэ двух месяцаў, але пра нашу “Клумбу” – артыкул у газеце БДУ, артыкул у газеце “Аргументы і факты”, інтэрв’ю на радыё. Нічога яшчэ не зроблена, а тут столькі інфармацыі, назад дарогі не было.

“За год свайго існавання маленькі паэтычны гурток з гучным дэвізам “Заклікаем да сябе ўсіх апантаных добрым мастацкім словам, на якой бы мове яно ні гучала” ператварыўся ў сапраўдны літаратурны клуб, які аб’яднаў студэнтаў універсітэта самых розных факультэтаў. На працягу года мы пісалі вершы, складалі і спявалі песні, разам адзначалі святы, праводзілі літаратурныя конкурсы і вечары, хадзілі ў паход, а галоўнае – мы пасябравалі. І я вельмі рада, што стала часткай гэтай дружнай літаратурнай сям’і”, – піша адна з удзельніц клуба ў артыкуле газеты “Літаратура і мастацтва”.

Так, публікацыі ў прэсе трэндам, ці тэндэнцыяй развіцця, клуба не назавеш, але гэта добры стымул, які падкормлівае любое аб’яднанне.

У нас за два гады набралася дастаткова многа публікацый. Пра падзеі, якія адбываюцца ў сценах нашага клуба, я пісала толькі на самым пачатку, цяпер публікацыямі займаюцца самі студэнты. Ім гэта падабаецца, і гэта, лічу, значна цікавейшае, чым піша арганізатар-каардынатар. Галоўныя наша выданне – гэта, вядома ж, універсітэцкая газета, якая так і называецца “Універсітэт”. А таксама беларуская літаратурная газета

“Літаратура і мастацтва”. Акрамя таго, маленькія артыкулы пра клуб, а галоўным чынам самі творы нашых клумбаўцаў рэгулярна з’яўляюцца на старонках саюзнага часопіса “Белая вежа”, а цяпер ўжо і рэспубліканскага літаратурна-мастацкага часопіса “Маладосць”. Час ад часу творы сябраў клуба з’яўляюцца на старонках навукова-асветніцкага часопіса “Сафія”, літаратурна-мастацкага часопіса “Бярозка” і нават сатырычна-гумарыстычнага часопіса “Вожык”.

У гэтым немалая дапамога нашага, як мы цяпер яго называем, хроснага бацькі “КЛУмБы” – пісьменніка Міхаіла Паўлавіча Пазнякова.

Міхаіл Паўлавіч сочыць за творчасцю нашых маладых аўтараў, накіроўвае і дапагае ім не толькі друкавацца ў перыядычным друку, але і выдаваць першыя асабістыя зборнікі. У серыі “Мінскія маладыя галасы” ўжо ў траіх клумбаўцаў выйшлі асабістыя зборнікі, яшчэ трое рыхтуюць. Студэнтку фізічнага факультэта Таццяну Купрыянец без чаргі запрасілі ўступіць у члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, а пытанне аб прыняцці ў Саюз студэнткі філалагічнага факультэта Кацярыны Роўда будзе вырашацца на чарговым пасяджэнні пісьменнікаў. Мы ўпэўнены: будзе вырашана станоўча. Усім вельмі падабаецца яе шчырая беларускамоўная паэзія, і рэкамендацыі для Кацярыны напісалі, можна сказаць, мэтры – Міхаіл Пазнякоў, Віктар Шніп і Анатоль Зэкаў.

Дарэчы, пра апошняга. Калі Міхаіла Пазнякова мы называем бацькам, то Анатоля Зэкава – сапраўдным сябрам нашага клуба. Ён быў адным з ініцыятараў стварэння клуба і параіў назваць менавіта клубам аматараў мастацкага слова, каб яго ўдзельнікамі маглі быць не толькі здольныя добра пісаць, але і тыя, якія могуць ацаніць сапраўднае мастацкае слова, любяць дэкламаваць, спяваць, ладзіць вечарыны, дыскусіраваць і г. д. Менавіта Анатоль Мікалаевіч імкнецца не прапускаць нашы пасяджэнні, нават хадзіў разам з намі ў двухдзённае падарожжа, бавіў час каля вогнішча, чытаў свае вершы, не спяваў, але з задавальненнем слухаў. Ён стаў рэдактарам нашага першынца – літаратурнага зборніка “Кветкавыя ветразі”.

Вось і яшчэ адзін супер-трэнд, які аб’яднаў 24 аўтараў, 24 станы душы на 142 старонках і стаў не апошнім стымулам для творчасці і жадання трымацца за “КЛУмБу”. Выйшаў зборнік у Выдавецкім цэнтры БДУ тыражом 100 экзэмпляраў. Тыраж невялікі, затое кошт касмічны. Радуе, што кожны аўтар атрымаў адзін экзэмпляр бясплатна.

Два тыдні назад мы прэзентавалі наш зборнік перад удзельнікамі міжнароднай канферэнцыі “Менеджмент універсітэцкіх бібліятэк”, прысвечанай юбілею Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Гэта быў своеасаблівы паэтычны спектакль з належным музычным афармленнем, тэатралізаванымі дзеяннямі, выконвалася папуры па вершах зборніка і спяваліся песні на яго асобныя вершы. Закончылася прадстаўленне вынасам драўлянай мадэлі парусніка з кветкавымі ветразямі, які былі зроблены актывістамі клуба Іванам і Алінай Цвірко. Між іншым, Аліна ў зборніку праходзіць пад дзявочым прозвішчам Карпіцкая, а Цвірко яна стала гэтым летам.

І вось гэта наш сапраўдны трэнд!!! Аліна і Іван пазнаёміліся на нашых вачах у лістападзе мінулага года (яшчэ не прайшоў і год з дня сустрэчы) падчас рэпетыцый над урыўкам з аповесці Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”. Аліна, студэнтка філілагічнага факультэта, была галоўнай гераіняй, яна выконвала ролю панны, спадчыніцы багатага роду. Нам не хапала добрага швейцара, які б выразна аб’яўляў гасцей балю, куды збіраліся госці з нагоды паўналецця гаспадыні. Выкладчыца гістарычнага факультэта прывяла да нас Івана. Гэта было тое, што нам трэба. Прыкладна праз чатыры месяцы Іван і Аліна аб’явесцілі на “Клумбе”, што яны жаніх і нявеста і ўлетку пажэняцца. Гэта навіна і здзівіла (надта хутка!), і не здзівіла. Толькі сляпы не бачыў, што яны сапраўдная пара. 15 верасня, у дзень бібліятэк Беларусі, на “КЛУмБе” ў сценах бібліятэкі мы віншавалі нашых маладых з іх законным шлюбам. Каб не клуб, не бібліятэка, ці знайшлі б сваё шчасце Іван і Аліна? У іх нарадзілася сям’я. І няхай іх сям’я будзе не менш дружнай, чым наша клумбаўская, бо наша “КЛУмБа” – сапраўдная сям’я.

Такія словы часта можна пачуць сярод клумбаўцаў.

А чаму і не? Калі дні народзін – святкуем разам, Масленіца і Вялікдзень – абавязкова, Новы год – вядома! На самым пачатку было крыху накладна. Не аднойчы са сваіх кішэняў прыходзілася аплочваць гарбату і розныя прысмакі. Зараз усё прасцей. Рэдкі выпадак, калі нехта прыйдзе з пустымі рукамі. І сталы іншым разам, асабліва на Масленіцу, проста ломяцца ад блінцоў і прысмакаў. А як мы адзначылі дзень нараджэння клуба! Тут і госці, і тэатралізаванае прадстаўленне, і фотазоны, і торт з выяваю клумбы, і хараводы, і многа-многа радасці.

Асноўнае месца сустрэч сябраў клуба – зала па рабоце з кніжнымі помнікамі, раней яна называлася чатальная зала рэдкай і каштоўнай кнігі. Амаль падчас кожнай сустрэчы любую тэму дапаўняе рубрыка “Кніжная Венецыя”. Рыхтуе яе вядучы бібліятэкар Марына Янаўна Курэйчык, яна добра ведае фонд гэтага аддзела і цікава, змястоўна прадстаўляе аматарам мастацкага слова тыя рарытэты, якія пасуюць тэме сустрэчы. Напрыклад, да сустрэчы з нагоды святкавання дня нараджэння ўніверсітэта былі прадэманстраваны творы Гарацыя і Ламаносава (дарэвалюцыйныя выданні) як узор высокай паэзіі ў жанры оды-прысвячэння.

У гэты дзень гасцямі былі пісьменнік, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі, універсітэтавед, аўтар кнігі пра ўніверсітэт Уладзімір Аляксандравіч Навумовіч і выкладчык універсітэта, доктар медыцынскіх навук Эдуард Іосіфавіч Збароўскі.

Духоўная тэматыка – а такая тэма ў нас традыцыйна праходзіць падчас чакання Нараджэння Хрыстова і падчас Вялікага паста – госць, выкладчык Інстытута тэалогіі імя святых Мефодзія і Кірыла БДУ, пратэірэй храма Опцінскіх старцаў Аляксандр Шымбалёў, выступіў з тэмай "Поэтика евангельского текста".

Дарэчы, у гэтым накірунку ў нас ёсць дастаткова цікавы вопыт. Напрыклад, спачатку прэзентацыя кнігі "Несвятыя святыя" архімандрыта Ціхана Шаўкунова ў сценах універсітэта, а потым сумесная літаратурна-музычная вечарына «Услышь дыхание любви», якая прайшла ў храме ў гонар св. прп. Серафіма Сароўскага г. Мінска. Яна была падрыхтавана клубам сумесна з Мінскім цэнтрам моладзі, і распавядалі мы тут пра кнігі духоўнага зместу, пра іх аўтараў, дзяліліся ўражаннямі, зачытвалі ўрыўкі. Вядучая вечарыны, нядаўняя выпускніца філалагічнага факультэта, актыўная ўдзельніца клуба Вікторыя Бежалева, нязмушана вяла адкрыты дыялог з аўдыторыяй: «... я ўбачыла гэтыя зацікаўленыя вочы, гэтую шчырую радасць, і такія сілы з'явіліся, што проста не змагла не падзяліцца самымі патаемнымі думкамі пра самі кнігі, пра герояў і тую самую Любоў ...». Прадстаўнікі абодвух бакоў абменьваліся сваімі найлепшымі паэтычнымі і музычнымі нумарамі. Колькі станоўчых эмоцый выказвалі потым клумбаўцы пра гэту сустрэчу!

Ці паездка ў мінулае Нараджэнне Хрыстова ў г. Жодзіна ў храм у гонар архістраціга Міхаіла, дзе клумбаўцаў чакаў сумесны святочны канцэрт і агульная трапеза. Ці не адтуль потым з'яўляюцца вершы, якія становяцца пераможцамі ў намінацыі конкурсу "Душа грустит о небесах"?

Моладзь вельмі хутка адгукаецца на ўсё цікавае. І зразумела, што ад нас залежыць, якім шляхам яна пойдзе, які выбар зробіць.

Трэндам для многіх бібліятэк, формай зацікаўлення і прыцягвання ўвагі чытача да бібліятэкі стала "Бібліяноч". Упершыню ў мерапрыемстве прымаюць удзел пяць бібліятэк Беларусі. Кожная бібліятэка мае свой тэматычны накірунак. Тэма Фундаментальнай бібліятэкі БДУ – "Сучасны дакументальны экран. Смачныя гісторыі".

Паглядзіце на нашых клумбаўцаў. Як іх радуе і прыцягвае беларуская мова, песня, нацыянальная вопратка, традыцыі! Яны актыўна ўдзельнічаюць у квэсце, конкурсах, віктарынах, крыжаванках, слухаюць і чытаюць "смачныя гісторыі". Выдатны трэнд!

Як і майскае падарожжа на радзіму класіка нашай літаратуры Янкі Купалы ў Вязынку. Сумеснае чытанне паэмы "Курган" ля яго помніка на малой радзіме пісьменніка, чытанне купалаўскіх радкоў па кнігах-малютках з фондаў нашай бібліятэкі, экскурсія ў Доме-музеі і па сядзібе, затым вогнішча і задушэўныя размовы, планы на будучае, гульні і песні, у асноўным беларускія.

І ніякія кантакты "Вконтакте" не заменяць вось такія паходы, вечарыны, дзе жывыя сяброўскія "абдымашкі", зацікаўленыя погляды і вершы, якія з увагай і добразычлівасцю паслухаюць сябры, праўда, не асабліва пакрытыкуюць, а канструктыўная крытыка, як кажуць некаторыя, ім вельмі патрэбна. Трэба вучыцца, баімся пакрыўдзіць. Збіраемся правесці дыспуты. Тэма аднаго з іх будзе гучаць прыкладна так: "Што такое ГРАФАМАНІЯ? І ці можна яе пазбегнуць?".

Прыязджайце да нас, і вы пачуеце выдатны гімн клуба, які напісаны самімі клумбаўцамі і выконваецца з вялікім энтузіязмам падчас пасяджэнняў. Вы зможаце прыняць удзел у літаратурных гульнях, у святкаванні Дня паэзіі, які збірае студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў бібліятэкі аднаго паэтычнага настрою. Вы ўбачыце, як "КЛУмБа" ператвараецца ў агітбрыгаду і экспромтам робіць канцэрт для супрацоўнікаў бібліятэкі з нагоды Міжнароднага жаночага дня, ці прафесійнага свята – Дня бібліятэк Беларусі. Вы пазнаёміцеся з сапраўдным палкоўнікам, намеснікам дэкана ваеннага факультэта Сяргеем Васільевічам Шэўчыкам, які не толькі прымае разам са сваімі курсантамі актыўны ўдзел у жыцці клуба, але і арганізоўвае нашы летнія паходы з экскурсіямі і вогнішчам да раніцы, дзе і шашлыкі, і песні, і вершы, і гульні.

Вядома, што знойдзецца нехта і скажа: гэта не трэнд, такое ўжо было. І добра, што было. Галоўнае, каб яно дапамагала жыць, чытаць, пісаць, а ў першую чаргу дапамагала быць чалавекам.

Хочацца закончыць сваё выступленне словамі мадэратара-адміністратара нашай "КЛУмБы" "Вконтакте", члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяны Купрыянец. Словамі, якія яна напісала напрыканцы верасня гэтага года пасля нашай апошняй сустрэчы: "Ребятушки, а догадываетесь, что я сегодня делала? Перебирала наши "веселые рифмы"! И знаете, что при этом чувствовала?... Ни за что не угадаете! В первую очередь, это запах "КЛУмБы". Да-да, именно так. Пирогов и печенек, которые так замечательно заходили под горячий чаек, осенних цветов, красиво переложенных ветками моей любимой рябины, и – чего-то неуловимого... Домашнего, не побоюсь этого слова, семейного уюта, который может быть только на "КЛУмБе"!… Большое-большое спасибки вам всем!!! Каждый знает, за что... Какие же вы родные!))))".

І, магчыма, гэтыя радкі каштуюць значна больш, чым усе навамодныя трэнды, разам узятыя.

І яшчэ. Клумбаўцы прасілі вам перадаць, што аматары мастацкага слова абавязкова павінны яднацца. Напрыклад, хаця б раз у год арганізоўваць міні-з'езды для абмену вопытам і творчасцю.